Сысоева Л.Л.

# ГЕНЕАЛОГИЯ ИЛЬИНИЧЕЙ: НОВЫЕ МАТЕРИАЛЫ

Благодаря исследованиям И.И. Иодковского[1] известна генеалогия рода Ильиничей. Однако он не указывал источники, которые подтверждают достоверность приведенных им фактов. Поэтому в настоящее время в связи с созданием экспозиции в Мирском замке возникла необходимость уточнения имеющейся информации.

Для этого был использован следующий материал: Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России[2]; Акты, относящиеся к истории Западной России[3]; материалы Национального исторического архива Беларуси[4]; монографии В.В. Калнина[5], посвященные Мирскому замку, и А.Н. Нарбута, в которой исследуется история родов Беларуси[6]. Научный интерес представляют труды К. Несецкого[7] и С. Выслоухи[8].

В результате проведенной нами работы некоторые сведения были уточнены, а также обнаружены новые данные. Старая схема И.И. Иодковского была почти полностью сохранена, а также дополнена.

Согласно И.И. Иодковскому, Ильиничи – магнатский род (герба «Корчак»), известный в Великом княжестве Литовском в XV–XVI вв. Родоначальником обычно считают Ивана. Он и его потомки назывались Ильиничами по имени их предка Ильи, которого еще князь Витовт освободил от доставки подвод на нужды государства, что подтверждается грамотой короля Казимира Ягеллона 1447 г.[9]

У И.И. Иодковского сведения об Иване (Ивашке) Ильиниче ограничивались перечнем его должностей, имений. Из архивных документов нами было установлено, что первое упоминание об Иване встречается в описании битвы с крестоносцами 18 сентября 1454 г. под Хойницами[10]. За преданность и спасение жизни монарху Ивашке Ильиничу было пожаловано Волковысское староство, он возведен в рыцари с получением родового герба «Корчак».

В ходе данного исследования была дополнена информация о сестрах Ивана – Ваське и N.N. Бутримовой. Так, нами установлено, что Васька записала своему брату Ивашке Тарасов и Малков не в 1490 г., а 9 апреля 1472 г., владение которыми король подтвердил ему в 1473 г.[11] О существовании второй сестры Ивана – N.N. Бутримовой, И.И. Иодковский не упоминал, а указывал на ее дочь Анну Бутримовну. Её удочерил Сенька Гедыголдович. Умирая бездетною, в 1476 г. Анна оставила запись, в которой дает Мир в пожизненное владение тетке своей Милохне, жене упомянутого Сенька Гедыголдовича, а после же ее смерти – брату своему Юрию Ильиничу[12].

Как установил И.И. Иодковский, у Ивашки было два сына: Николай и Юрий. Николай Иванович Ильинич имел сына Николая и трех дочерей –

Анну Зеновичеву, Елизавету Шеметову и неизвестную. Нами было обнаружено имя третьей дочери – Катажины Николаевны Ильиничанки[13], впоследствии вышедшей замуж за Збожного Вернировича. Второй сын Ивашки Ильинича – Юрий – получил имение Мир от Анны Бутримовны. Это наследство подтверждено дополнительным завещанием в 1486 г.[14] (а не в 1485 г. по И.И. Иодковскому).

Кроме этого, нами найдены новые факты. Юрий, вероятно, наследовал по отцу значительные имения, о которых он упоминает в своем завещании, а именно: Чернавчицы, Черново, Малково, Коморово, Воронцевичи и др.[15]. Женой Юрия Ильинича была Ядвига, дочь Яна Юрьевича Заберезинского (Забжезинского), воеводы трокского, маршалка и полоцкого старосты. Ян Заберезинский записал Юрию Ильиничу и его жене, а своей дочери, третью часть Шерешова в сумме 580 коп. литовских грошей[16]. И.И. Иодковский считал приблизительной датой смерти Юрия Ильинича 1520 г., а архивные материалы позволили уточнить дату его смерти – 1526 г.[17] Он похоронен в костеле Св. Станислава в Вильно рядом со своей женой[18], умершей при родах дочери Ядвиги.

И.И. Иодковский сообщал о дочери Ивана Ильинича, которая была замужем за Доброгостом Нарбутовичем. По новым сведениям в архивных материалах стало известно, что Доброгост в 1496 г. имел дело о четвертой части Нарбучева, которую покойник Иван Ильинич купил у Ивана Гурского и ему подарил. Король Александр решением от 20 августа 1496 г. владение того имения Доброгостом подтвердил. Пани Доброгостова пережила мужа и в 1506 г. имела дело с Альбрехтом Гаштольдом о дворе в Островне[19].

Интерес представляют сведения о детях и внуках Николая Ивановича Ильинича. И.И. Иодковский дал о них самую краткую информацию, которая была дополнена в ходе нашей работы. Было установлено следующее: Николай Николаевич Ильинич никаких должностей не занимал, имел жестокий характер, пьянствовал, потерял почти весь свой капитал. Пан Александр Солтанович в 1516 г. подал жалобу на пана Николая Ильинича, заехавшего на его двор, забравшего хлеб и убившего его слугу. Николай Николаевич Ильинич был женат на Эльжбете Якубовне Немиричанке и умер осенью 1536 г. Он оставил двух сыновей: Ивана (Яна) и Щасного, которые не играли существенной роли в делах государства, и дочь Анну, жену Яна Гедройца[20]. Вдова Николая Ильинича жила долго и даже пережила своих сыновей[21].

Дочь Николая – Анна Николаевна Ильиничанка – была женой Николая Зеновьевича. Имение свое по матери, третью часть двора Зельвы, записала своему мужу, который его перепродал Юрию Ильиничу. Умерла без потомства[22].

Вторая дочь Николая – Елизавета (Эльжбета). Выдана замуж через своего дядю, Юрия Ивановича Ильинича, за пана Яна Шеметовича. Она

умерла в 1524 г. Распоряжением в завещании Елизавета объявила свое желание быть похороненной в парафиальном костеле Святого Якуба в Великой Зельве, своем имении, полученном в наследство от матери. Зельву, как и другие свои имения, она записала своей дочери Анне, для которой определила опекуном своего мужа, а ее отца, Яна Шеметовича. Вероятно, тело ее покоится в Зельве. Ее дочь, Анна Шеметовна, после смерти матери вышла замуж около 1531 г. за пана Лаврина Вольского[23].

Третья дочь Николая Ильинича – Катажина, имя которой И.И. Иодковский не указывал, так же как и сестра выдана замуж через своего дядю Юрия Ильинича за пана Збожного Вернеровича. Оба умерли до 1529 г., оставив сына Станислава и дочь Анну[24].

Сведения о детях Юрия Ивановича носят у исследователя более полный характер. Старший сын Юрия – Иван (Ян), по И.И. Иодковскому, в 1526 г. получил завещанные отцом имения – Чернавчицы, Лынтупы и Комарово. Однако эти сведения можно дополнить. Юрий своим завещанием 1526 г. лишает сына наследственных прав за то, что «отцу своему приносил большие горести и неприятности»[25]. Но после смерти Юрия Иван возобновляет свои права на наследство. В 1526 г. он получил имение Чернавчицы. Кроме того, Станислав Ильинич уступил своим братьям, Ивану и Щасному, Лынтупы и Комарово, которые они делят пополам. Воронцевичами братья владеют совместно. Иван Юрьевич Ильинич был в милости у короля, который 19 августа 1528 г. жалует ему держание городов Мстиславля и Радомля, с предоставлением половины даней князю Михаилу Мстиславскому. В следующем, 1529 г., наместник мстиславский Иван Ильинич получает еще два королевских листа о делах монастырей Пустынского и Онуфриевского[26]. Эти факты подтверждаются грамотами, которые можно найти в Актах, относящихся к истории Западной России[27]. Иван умер бездетным весной 1537 г.[28]. В том же году 24 января он написал завещание, которым своей жене Эльжбете Фридриховне оставил третью часть владений, а остальное свое имущество брату Щасному. Иван Юрьевич похоронен рядом с родителями в кафедральном костеле Св. Станислава в Вильно.

Сведения о втором сыне Юрия – Николае – ограничивались только именем. Была определена дата смерти Николая, умершего вскоре за отцом в том же 1526 г., не дожив даже до раздела отцовского состояния[29].

В 1531 г. умирает третий сын Юрия Станислав, который, по И.И. Иодковскому, в 1526 г. получает от отца Мир. Эта дата была нами уточнена. Согласно архивным документам, в наследство от отца он в 1527 г. получил Мир, а от матери ему досталась четвертая часть Белой. В 1528 г. он ставил 55 коней[30], кроме того, с неподеленного с братьями имения Воронцевичи – 7 коней[31]. Станислав владел Миром недолго. В 1531 г. он умер молодым и неженатым. Был отравлен на банкете женой своего слуги Новицкого. Суд

присудил виновной сожжение, а приговор совершил брат покойного Щасный. Уже в ноябре того же 1531 г. началось дело между Щасным и Иваном Ильиничами о Мире, наследственном владении по их умершему родному брату Станиславу.

Информация о четвертом сыне Юрия – Щасном (Феликсе) – также была нами дополнена. В наследство от матери ему досталась четвертая часть Белой. Как отмечалось выше, в 1531 г., после смерти Станислава, началось дело между Щасным и Иваном Ильиничами о Мире. Мирский замок достался Щасному, а другие мирские владения были отданы Ивану. В 1528 г. Щасный ставил 32 коня[32]. Его жена Софья Радзивилл умерла в 1544 г. и похоронена в Вильно. Его единственный сын Юрий стал последним представителем рода Ильиничей, и новых сведений о нем не найдено.

В документах прослеживается и судьба двух дочерей Юрия –Ядвиги и Анны. Ядвига была замужем за Яном Абрамовичем, который в 1528 г. ставил в войско 43 коня[33]. Она умерла, не дожив до 30 лет.

Анна вышла замуж за Петра Станиславовича Кишку[34], старосту дрогичинского, воеводу полоцкого (1521), каштеляна трокского и старосту жмудского (1532), который в 1528 г. выставлял в войско 224 конника[35].

Таким образом, исследование И.И. Иодковского положило начало изучению генеалогии рода Ильиничей. Информация, изложенная в его статье, является основополагающей и в настоящее время может быть использована с некоторыми уточнениями и дополнениями.

---

1 Иодковский И.И. Замок в Мире // Древности. Труды комиссии по сохранению древних памятников, состоящем при Императорском Московском Археологическом Обществе. Под ред. И.П. Машкова. – М., 1915. – Т. 6.

2 Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею. – СПб., 1863–1892. – Т. 1–15.

3 Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и издаваемые археографическою комиссиею. – СПб., 1846–1853. – Т. 1–15.

4 НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4.; Ф. 1767. Оп. 1. Д. 19.; Ф. 1774. Оп. 1. Д. 23.; Ф. 1774. Оп. 1. Д. 1.

5 Калнін В.В. Мірскі замак. – Мн., 2002.

6 Нарбут А.Н. Генеалогия Белоруссии. – М., 1994. – Вып. 2.

7 Niesieckie K. Herbarz Polski. – Lipsku, 1893. – T. IV.

8 Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8.

9 Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России (1361–1598). – СПб., 1863. – Т. 1. – С. 19.

[10] Niesieckie K. Herbarz Polski. – Lipsku, 1893. – T. IV. – С. 401; НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 2.
[11] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4.
[12] Иодковский И. С. LVIII; НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4.
[13] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4–6, 17.
[14] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 5–6.
[15] Там же.
[16] Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 60–61. Перевод с польского языка Мазовко Н.К. Материал любезно предоставлен Трифоновой Н.Я., которой автор выражает благодарность.
[17] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 21.
[18] Там же.
[19] Там же. С.14.
[20] Нарбут А.Н. Генеалогия Белоруссии. – М.,1994. – Вып. 2. – С. 153.
[21] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 15–16.
[22] Там же. С. 16.
[23] Там же. С. 16–17.
[24] Там же. С. 17.
[25] Там же.
[26] Там же. С. 18.
[27] Акты, относящиеся к истории Западной России. – СПб., 1848. – Т. 2. – С. 189, 206.
[28] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 20.
[29] Там же. С. 21.
[30] Wyslouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wilenskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 78.
[31] Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. – Мн., 2003. – С. 247.
[32] Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933– R. 8. – S. 78.
[33] Там же.
[34] НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. – С. 23.
[35] Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 78.

Сысоева Л.Л.

# ГЕНЕАЛОГІЯ ІЛЛІНІЧАЎ: НОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Дзякуючы даследаванням І.І. Ядкоўскага[1] вядома генеалогія роду Іллінічаў. Аднак ён не ўказваў крыніцы, якія пацвярджаюць пэўнасць прыведзеных ім фактаў. Таму ў цяперашні час у сувязі са стварэннем экспазіцыі ў Мірскім замку ўзнікла неабходнасць удакладнення наяўнай інфармацыі.

Для гэтага быў выкарыстаны наступны матэрыял: Акты, якія адносяцца да гісторыі Паўднёвай і Заходняй Рассіі[2]; Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі[3]; матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі[4]; манаграфіі В.В. Калніна[5], прысвечаныя Мірскаму замку, і А.М. Нарбута, у якой даследуецца гісторыя родаў Беларусі[6]. Навуковую цікавасць уяўляюць працы К. Нясецкага[7] і С. Выслаухі[8].

У выніку праведзенай намі работы некаторыя звесткі былі ўдакладнены, а таксама выяўлены новыя дадзеныя. Старая схема І.І. Ядкоўскага была амаль цалкам захавана і дапоўнена.

Паводле І.І. Ядкоўскага, Іллінічы – магнацкі род (герба «Корчак»), які быў вядомы ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. Родапачынальнікам звычайна лічаць Івана. Ён і яго нашчадкі зваліся Іллінічамі па імені іх продка Іллі, якога яшчэ князь Вітаўт вызваліў ад дастаўкі фурманак на патрэбы дзяржавы, што пацвярджаецца граматай караля Казіміра Ягелона 1447 г.[9]

У І.І. Ядкоўскага звесткі пра Івана (Івашку) Ілініча абмяжоўваліся пералікам яго пасад, маёнткаў. З архіўных дакументаў намі было высветлена, што першае згадванне пра Івана сустракаецца ў апісанні бітвы з крыжаносцамі 18 верасня 1454 г. пад Хойніцамі[10]. За адданасць і выратаванне жыцця манарху Івашку Іллінічу было падаравана Ваўкавыскае староства і нададзены рыцарскі чын з атрыманнем радавога герба «Корчак».

Падчас дадзенага даследавання была дапоўнена інфармацыя аб сёстрах Івана – Васьцы і N.N. Бутрымавай. Так, намі ўстаноўлена, што Васька запісала свайму брату Івашку Тарасаў і Малкаў не ў 1490 г., а 9 красавіка 1472 г., валоданне якімі кароль пацвердзіў яму ў 1473 г.[11] Аб існаванні другой сястры Івана – N.N. Бутрымавай, І.І. Ядкоўскі не згадваў, а паказваў на яе дачку Ганну Бутрымаўну. Яе ўдачарыў Сенька Гедыголдавіч. Паміраючы бяздзетнаю, у 1476 г. Ганна пакінула запіс, у якой дае Мір у пажыццёвае валоданне цётцы сваёй Мілохне, жонцы згаданага Сенькі Гедыголдавіча, а пасля ж яе смерці – брату свайму Юрыю Іллінічу[12].

Як устанавіў І.І. Ядкоўскі, у Івашкі было два сыны: Мікалай і Юрый. Мікалай Іванавіч Ілініч меў сына Мікалая і трох дачок – Ганну Зяновічаву, Лізавету Шэметаву і невядомую. Намі было выяўлена імя трэцяй дачкі – Катажыны Мікалаеўны Іллінічанкі[13], якая ў далейшым выйшла замуж за Збожнага Верніровіча. Другі сын Івашкі Ілініча – Юрый – атрымаў маёнтак Мір ад Ганны Бутрымаўны. Гэтая спадчына пацверджана дадатковым завяшчаннем у 1486 г.[14] (а не ў 1485 г. па І.І. Ядкоўскаму).

Акрамя гэтага, намі знойдзены новыя факты. Юрый, верагодна, атрымаў у спадчыну ад бацькі значныя маёнткі, аб якіх ён згадвае ў сваім завяшчанні, а менавіта: Чарнаўчыцы, Чарнова, Малкава, Камарова, Варанцэвічы і інш.[15] Жонкай Юрыя Ілініча была Ядвіга, дачка Яна Юр'евіча Забярэзінскага (Забжазінскага), ваяводы трокскага, маршалка і полацкага старасты. Ян Забярэзінскі запісаў Юрыю Іллінічу і яго жонцы, а сваёй дачцэ трэцюю частку Шарашова ў суме 580 кап. літоўскіх грошай[16]. І.І. Ядкоўскі лічыў прыблізнай датай смерці Юрыя Ілініча 1520 г., а архіўныя матэрыялы дазволілі ўдакладніць дату яго смерці – 1526 г.[17] Ён пахаваны ў касцёле Св. Станіслава ў Вільні побач са сваёй жонкай[18], якая памерла пры родах дачкі Ядвігі.

І.І. Ядкоўскі паведамляў аб дачцэ Івана Ілініча, якая была замужам за Дабрагостам Нарбутовічам. Па новых звестках з архіўных матэрыялаў стала вядома, што Дабрагост у 1496 г. меў справу аб чацвёртай частцы Нарбучава, якую нябожчык Іван Ілініч купіў у Івана Гурскага і яму падарыў. Кароль Аляксандр рашэннем ад 20 жніўня 1496 г. валоданне таго маёнтка Дабрагостам пацвердзіў. Пані Дабрагостава перажыла мужа і ў 1506 г. мела справу з Альбрэхтам Гаштольдам аб двары ў Астроўні [19].

Цікавасць уяўляюць звесткі аб дзецях і ўнуках Мікалая Іванавіча Ілініча. І.І. Ядкоўскі даў аб іх самую кароткую інфармацыю, якая была дапоўнена падчас нашай работы. Было ўстаноўлена наступнае: Мікалай Мікалаевіч Ілініч ніякіх пасад не займаў, меў жорсткі характар, п'янстваваў, страціў амаль увесь свой капітал. Пан Аляксандр Салтановіч у 1516 г. падаў скаргу на пана Мікалая Ілініча, які заехаў на яго двор, забіў яго служку і забраў хлеб. Мікалай Мікалаевіч Ілініч быў жанаты на Эльжбеце Якубаўне Немірычанцы і памёр увосень 1536 г. Ён пакінуў двух сыноў: Івана (Яна) і Шчаснага, якія не адыгрывалі істотнай ролі ў справах дзяржавы, і дачку Ганну, жонку Яна Гедройца[20]. Удава Мікалая Ілініча жыла доўга і нават перажыла сваіх сыноў[21].

Дачка Мікалая – Ганна Мікалаеўна Іллінічанка – была жонкай Мікалая Зяноўевіча. Маёнтак свой па маці, трэцюю частку двара Зельвы, запісала свайму мужу, які перапрадаў яго Юрыю Іллінічу. Памерла без нашчадкаў[22].

Другая дачка Мікалая – Лізавета (Эльжбета). Выдадзена замуж праз свайго дзядзьку, Юрыя Іванавіча Ілініча, за пана Яна Шэметавіча. Яна памерла ў 1524 г. Распараджэннем у завяшчанні Лізавета абвясціла сваё жаданне быць пахаванай у парафіяльным касцёле Святога Якуба ў Вялікай Зельве, сваім маёнтку, атрыманым у спадчыну ад маці. Зельву, як і іншыя свае маёнткі, яна запісала сваёй дачцэ Ганне,

для якой вызначыла апекуном свайго мужа, а яе бацьку, Яна Шэметавіча. Верагодна, цела яе было пахавана ў Зельве. Яе дачка, Ганна Шэметаўна, пасля смерці маці выйшла замуж каля 1531 г. за пана Лаўрына Вольскага[23].

Трэцяя дачка Мікалая Ілініча – Катажына, імя якой І.І. Ядкоўскі не паказваў, таксама як і сястра выдадзена замуж праз свайго дзядзьку Юрыя Іллініча за пана Збожнага Верняровіча. Абое памерлі да 1529 г., пакінуўшы сына Станіслава і дачка Ганну[24].

Звесткі пра дзецей Юрыя Іванавіча носяць у даследніка больш поўны характар. Старэйшы сын Юрыя – Іван (Ян), па І.І. Ядкоўскаму, у 1526 г. атрымаў адпісаныя бацькам маёнткі – Чарнаўчыцы, Лынтупы і Камарова. Аднак гэтыя звесткі можна дапоўніць. Юрый сваім завяшчаннем 1526 г. пазбаўляе сына спадчынных праў за тое, што «бацьку свайму прыносіў вялікія нягоды і непрыемнасці»[25]. Але пасля смерці Юрыя Іван аднаўляе свае правы на спадчыну. У 1526 г. ён атрымаў маёнтак Чарнаўчыцы. Акрамя таго, Станіслаў Іллініч уступіў сваім братам, Івану і Шчаснаму, Лынтупы і Камарова, якія яны палавіняць. Варанцэвічамі браты валодаюць сумесна. Іван Юр'евіч Іллініч быў у ласцы ў караля, які 19 жніўня 1528 г. надае яму трыманне гарадоў Мсціслаўля і Радомля, з аддаваннем паловы даніны князю Міхаілу Мсціслаўскаму. У наступным, 1529 г., намеснік мсціслаўскі Іван Іллініч атрымлівае яшчэ два каралеўскіх лісты аб справах кляштараў Пустынскага і Ануфрыеўскага[26]. Гэтыя факты пацвярджаюцца граматамі, якія можна знайсці ў Актах, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі[27]. Ян памёр бяздзетным увесну 1537 г.[28] У тым жа годзе, 24 студзеня, ён напісаў завяшчанне, якім сваёй жонцы Эльжбеце Фрыдрыхаўне пакінуў трэцюю частку валоданняў, а астатнюю свая маёмасць брату Шчаснаму. Іван Юр'евіч пахаваны побач з бацькамі ў кафедральным касцёле Св. Станіслава ў Вільні.

Звесткі пра другога сына Юрыя – Мікалая – абмяжоўваліся толькі імем. Была вызначана дата смерці Мікалая, які памёр неўзабаве за бацькам у тым жа 1526 г., не дажыўшы нават да падзелу бацькоўскай маёмасці[29].

У 1531 г. памірае трэці сын Юрыя Станіслаў, які, па І.І. Ядкоўскаму, у 1526 г. атрымлівае ад бацькі Мір. Гэтая дата была намі ўдакладнена. Паводле архіўных дакументаў, у спадчыну ад бацькі ён у 1527 г. атрымаў Мір, а ад маці яму дасталася чацвёртая частка Белай. У 1528 г. у яго было 55 коней[30], акрамя таго, з непадзеленага з братамі маёнтка Варанцэвічы – 7 коней[31]. Станіслаў валодаў Мірам нядоўга. У 1531 г. ён памірае маладым і нежанатым. Быў атручаны на банкеце жонкай свайго слугі Навіцкага. Вінаватую прысудзілі да спалення, а прысуд здзейсніў брат нябожчыка Шчасны. Ужо ў лістападзе таго ж 1531 г. пачалося справа паміж Шчасным і Іванам Іллінічамі аб Міры, спадчынным уладанні па іх памерламу роднаму брату Станіславу.

Інфармацыя пра чацвёртага сына Юрыя – Шчаснага (Фелікса) – таксама была намі дапоўнена. У спадчыну ад маці яму дасталася чацвёртая частка Белай. Як адзначалася вышэй, у 1531 г., пасля смерці Станіслава, пачалася справа паміж Шчасным і Івнам Іллінічамі аб Міры. Мірскі замак дастаўся Шчаснаму, а іншыя Мірскія ўладанні былі аддадзены Івану. У 1528 г. Шчасны меў 32 кані[32]. Яго жонка Соф'я Радзівіл памерла ў 1544 г. і пахавана ў Вільні. Яго адзіны сын Юрый стаў апошнім прадстаўніком роду Іллінічаў, і новых звестак пра яго не знойдзена.

У дакументах прасочваецца і лёс дзвюх дачок Юрыя – Ядвігі і Ганны. Ядвіга была замужам за Янам Абрамавічам, які ў 1528 г. ставіў у войска 43 кані[33]. Яна памерла, не дажыўшы да 30 гадоў.

Ганна выйшла замуж за Пятра Станіслававіча Кішку[34], старасту драгічынскага, ваяводу полацкага (1521), кашталяна трокскага і старасту жмудскага (1532), які ў 1528 г. выстаўляў у войска 224 конніка[35].

Такім чынам, даследаванне І.І. Ядкоўскага паклала пачатак вывучэнню генеалогіі роду Іллінічаў. Інфармацыя, пададзеная ў яго артыкуле, з'яўляецца асноватворнай і зараз можа быць выкарыстана з некаторымі ўдакладненнямі і дадаткамі.


[1]. Иодковский И.И. Замок в Мире // Древности. Труды комиссии по сохранению древних памятников, состоящем при Императорском Московском Археологическом Обществе. Под ред. И.П. Машкова. – М., 1915. – Т. 6.

[2]. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею. – СПб., 1863–1892. – Т. 1–15.

[3]. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и издаваемые археографическою комиссиею. – СПб., 1846–1853. – Т. 1–15.

[4]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4.; Ф. 1767. Оп. 1. Д. 19.; Ф. 1774. Оп. 1. Д. 23.; Ф. 1774. Оп. 1. Д. 1.

[5]. Калнін В.В. Мірскі замак. – Мн., 2002.

[6]. Нарбут А.Н. Генеалогия Белоруссии. – М., 1994. – Вып. 2.

[7]. Niesieckie K. Herbarz Polski. – Lipsku, 1893. – T. IV.
[8]. Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8.
[9]. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России (1361–1598). – СПб., 1863. – Т. 1. – С. 19.
[10]. Niesieckie K. Herbarz Polski. – Lipsku, 1893. – T. IV. – C. 401; НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 2.
[11]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4.
[12]. Иодковский И.С. LVIII; НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4.
[13]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 4–6, 17.
[14]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 5–6.
[15]. Там жа.
[16]. Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 60–61. Пераклад з польскай мовы Мазоўка Н.К. Матэрыял прадстаўлены Трыфанавай Н.Я., якой аўтар выказвае шчырую падзяку.
[17]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 21.
[18]. Там жа.
[19]. Там жа. С.14.
[20]. Нарбут А.Н. Генеалогия Белоруссии. – М.,1994. – Вып. 2. – С. 153.
[21]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 15–16.
[22]. Там жа. – С. 16.
[23]. Там жа. С. 16–17.
[24]. Там жа. С. 17.
[25]. Там жа.
[26]. Там жа. С. 18.
[27]. Акты, относящиеся к истории Западной России. – СПб., 1848. – Т. 2.– С. 189, 206.
[28]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 20.
[2]9. Там жа. С. 21.
[30]. Wyslouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wilenskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 78.
[31]. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. – Мн., 2003. – С. 247.
[32]. Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 78.
[33]. Там жа.
[34]. НИАБ. Ф. 694. Оп. 1. Д. 4. С. 23.
[35]. Wysłouch S. Dobra Szereszewskie // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1933. – R. 8. – S. 78.